На здымку: у рэдакцыі газеты "Голас Беларусаў" ў першым радзе мастак **Міхась Калінін**, артыстка **Анастасія Крэйц** (выканаўца ролі Паўлінкі), палітычны і грамадскі дзеяч **Кастусь Езавітаў,** паэт **Пятро Сакол** (Масальскі), мастак **Пётра Мірановіч.** Над імі (у другім радзе) — **Валянціна Казлоўская.**

Валянціна КАЗЛОЎСКАЯ

Заўсёды гатова!

За гонар Айчыны, за роднае слова,
За лепшую долю братом, —
Я ўмерці з адвагай заўсёды гатова,
У змаганьні з няпраўдай і злом!

Пракляцьці ўсе тыя, што стогнуць наўкола,
Віхры, што над Краем шумяць,
З радзімых нябес я заўсёды гатова
Ад сонца і зор разагнаць!

Няхай усе ведаюць, бачуць ўсе людзі —
Кахае свой край беларус!
Мазольныя рукі і моцныя грудзі
Асілюць чужацкі прымус!

Травень 1926 году. Дзьвінск.

Я.Купале

(Юбілейнае прывітаньне)
Сьвяты агонь ў тваёй душы судзьбіна запаліла,
У рукі гусьлі звонкія яна табе дала,
Кахаць Айчыну шчыра навучыла,
Да сонца і да зорак павяла.

Адвечны лес, і шэпат кветак ў полі,
І гоман вольнае, срабрыстае ракі,
І стогн наўкол аб страчанае долі —
Табе у гусьлі сьпеў ўлілі.

Сьпявай, Пясьняр! Хай зыкі тваіх сьпеваў
Зьдзяруць з братоў нядолі ланцугі,
Й на нівах бацькаўскіх, між воражых пасеваў,
Узмацуюць Праўды й Волі каласы!

Чэрвень, 1925 г. Люцын.

Ластаўчына песня

Я шчасьце, я радасьць, вясну я нясу.
Прачніся ад сну, мілы краю!
Зірні! — ужо сонца іскрыцца, гарыць,
І буслы клякочуць у гаю.

Вясна наступіла, вясна крывічоў.
Гэй, моладзь! Да працы, за долю народа —
Прысвеціць цябе люд крывіцкі гатоў
І родная маці-прырода!

Ахвярую К.Каліноўскаму

Памерці за волю народу —
Лепшай долі няма на зямле.
Асьвяціць шлях братом хоць на момант
І пагасну́ць зноў ў цемры і зьле.

Можа зьдзекі, прымусы й ня зьгінуць,
Але сьвет той усё-ж будзе гарэць!
І ён брацьцяў маіх, люд гаротны,
Да сьвятлейшай сьцягі давядзець.

Вучаніца II клясы гімназіі.

ПРОЕКТ

Вода на продажу

Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды определило наиболее перспективные места для строительства заводов по производству бутилированной воды, сообщили БЕЛТА в пресс-службе Минприроды.

По данным исследований, наиболее перспективными для размещения заводов по производству бутилированной воды являются: на территории Брестской области — участок водозабора "Аэропорт" (Брест), Витебской — участок водозабора "Стаи" (Лепель), Гродненской — участки водозаборов "Пышки" (Гродно) и "Валовка" (Новогрудок), Гомельской — участок водозабора "Озерщина" (Речица).

На территории Минской области наиболее перспективными для размещения завода по бутилированию пресной подземной воды являются участки водозаборов "Новинки" (район д.Зацень), "Боровляны" (район д.Дифференция и д.Пильница), "Волма" (район д.Королев Стан и п.Городище) и водозабора п.Сосны. Кроме этого, в пределах Минского района могут быть размещены цеха розлива пресных подземных вод в пределах Петришского сельсовета (д.Светлый Путь, д.Недреска), Хатежинского сельсовета (д.Птичь), Боровлянского сельсовета (д.Цна, территория 1-й Минской птицефабрики). "В других районах Минской области благоприятными для добычи и розлива пресных подземных вод могут быть территории водозаборов "Северный" и "Криница", — отметили в министерстве.

ЧУЛІ?

Паязды будуць праходзіць міма…

Станцыю Мінскага метрапалітэна "Кастрычніцкая", адкрытую ў 1984 годзе, плануецца закрыць на рэканструкцыю.

Як паведаміў БелаПАН галоўны інжынер дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Аляксей Мурач, рашэнне аб тэрмінах закрыцця станцыі будзе прынята ў хуткім часе. Паводле яго інфармацыі, за два тыдні павінны быць распрацаваныя варыянты перанакіроўвання пасажырапатоку.

Падчас рэканструкцыі будуць устаноўлены чатыры эскалатары замест трох за кошт змяншэння адлегласці паміж імі. *"Нам дадзены сцісьлыя тэрміны для рэканструкцыі. Мы яе павінны закончыць да 1 лістапада гэтага года"*, — зазначыў А.Мурач.

Рэканструкцыя праводзіцца з мэтай павелічэння прапускной здольнасці перасадачнага вузла метрапалітэна.

Марына НОСАВА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Суд разбіраецца

Я жыву ў мінскім мікраёне "Кунцаўшчына". Восенню мінулага года ў нас было жудаснае здарэнне: казалі, што бацька забіў дачку і потым па частках раскідаў часткі цела па розных сметніцах. Ці быў ужо суд па гэтай страшэннай справе?

Галіна Лешчанок.

Слуханні гэтай справы, якая сапраўды ў ліпені мінулага года ўскалыхнула ўвесь горад, праходзяць зараз у Мінскім гарадскім судзе. Па абвінавачанні ў забойстве 25-гадовай дачкі на лаве падсудных аказаўся яе 67-гадовы бацька. Пракурор лічыць яго віну даказанай і запрасіў для мужчыны пакаранне ў 25 гадоў пазбаўлення волі.

Прыгавор пакуль не абвешчаны. І, дарэчы, галава дзяўчыны так і не была знойдзена.

Падсудны не прызнаў сваёй віны. Ён сцвярджае, што ў кватэру, дзе ён пражываў з дачкой, уварваліся невядомыя, ударылі яго, і ён страціў прытомнасць. Калі ачуняў — убачыў, што дачка знікла. Адвакаты лічаць, што следства даказала забойства дзяўчыны, але не знайшло доказаў таго, што менавіта бацька яе забіў. Чым скончыцца гэта справа — мы раскажам у наступных нумарах.

Алена НОВІКАВА.

ЗДАРЭННЕ

Адзін чалавек загінуў…

На ААТ "Палімір" у Наваполацку ў выніку выкіду сінільнай кіслаты пацярпелі чатыры чалавекі.

Пра гэта паведаміла прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Марына Фандо. Пацярпелыя былі дастаўлены ў Наваполацкую цэнтральную гарадскую бальніцу. Адзін з іх памёр у рэанімацыі. Аб стане астатніх пацярпелых кіраўніцтва бальніцы інфармацыю даць адмовілася.

Пры дэмантажы клапана на трубаправодзе адбыўся выкід сінільнай кіслаты. Нагадаем, што сінільная кіслата ёсць наймацнейшы яд.

Марына НОСАВА.

Дагуляліся…

У дзіцячым аздараўленчым лагеры пад Гомелем вучань 4-га класа адной са школ абласнога цэнтра загінуў у выніку свавольства свайго сябра.

Як паведаміў пракурор Гомельскага раёна Валерый Праханаў, прыкладна ў 21.40 дзеці вярталіся з дыскатэкі ў спальны корпус, сталі дурэць, і адзін хлопчык зачыніў перад другім шкляныя дзверы. У выніку яго сябар, вучань 4-га класа, ударыўся галавой у шкло, параніўся асколкамі і памёр.

Па факце гібелі дзіцяці пракуратура Гомельскага раёна праводзіць праверку.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

НАШЫ ПЕСНЯРЫ

Вацлаў ЛАСТОЎСКІ

Коратка пра аўтара: Вацлаў ЛАСТОЎСКІ (1883—1938) — вядомы дзеяч нацыянальнага вызваленчага руху, гісторык, пісьменнік, публіцыст, акадэмік АН БССР. У 1930 годзе быў арыштаваны і высланы за межы Беларусі. Расстраляны ў Саратаве ў 1938 годзе.

Публікуецца з невялікімі скарачэннямі і захаваннем правапісу аўтара.

Успаміны аб Янку Купалу

З творчасцю Янкі Купалы я пазнаёміўся ў Пецярбургу ў 1906 годзе. Тады прыбылі там поштай рукапісы яго вершаў, якія пасля ўвайшлі ў зборнічак "Жалейка", і іх чытаў, у кружку тагачасных пецярбургскіх беларусаў, прафесар Эпімах-Шыпіла.

Асабіста ж я пазнаў Янку Купалу толькі ў першых датах сакавіка месяца 1909 года, калі пераехаў з Рыгі на сталую працу ў Вільню, куды быў запрошаны А.Уласавым на сакратара рэдакцыі "Наша ніва", якая тады памяшчалася на Віленскай вуліцы, д.20, у часова пуставаўшым магазыновым памяшканні, з уходам з тратуара. Прыехаў я ў Вільню вечарам і таго ж дня адведаў рэдакцыю, дзе пазнаёміўся з А.Уласавым, Іванам і Антонам Луцкевічамі і Альгердам Бульбай. З размоў даведаўся, што стала ў рэдакцыі працуюць яшчэ Антон Лявіцкі і Янка Купала, але іх не было дома.

Рэдакцыйнае памяшканне дзялілася на дзве палавіны: ад вуліцы, у быўшым магазыне, была кантора рэдакцыі, ад падворку ж пакой, у тры вакны, з прысёнкам — кватэра Уласава, і ў ім маленькі зачатак будучага беларускага Музея, які збіраў Іван Луцкевіч. У прывулічным памяшканні акром рэдакцыйнай канторы быў яшчэ начлежны лёкум для трох асоб: А.Лявіцкага, за дашчанай перагародкай справа, Я.Купалы і рабочага Нагурскага — за шафай, збітай з негабляваных дошак.

На другі дзень прыйшоў я ў рэдакцыю рана і застаў усіх кватарантаў канторы ў поўным камплекце і даволі кіслых настраеннях, якія былі вынікам дрэнных кватэрных варункаў. Кантора была ў запушчаным стане і на першы погляд рабіла ўражанне складу макулатуры, якая ў постаці ўсякіх газет была звалена каля сцен і сторшылася на паліцах спамянёнай дашчанай шафы. Наганялі нуду даўно не аднаўляныя і спрадвеку не апыляныя сцены. Паветра было прасычана кіслай вільгаццю, дымам ад жалезнай печкі, на якой пякліся прамочаныя наскрозь учора звечара чыесь камашы, і тут жа, у скаводцы, сквірчэлі скваркі, якія з вялікім адданнем асцярожна мяшаў пальцам чалавек з рыжаватай бародкай, у расхрыстанай кашулі і ў апорках на босую нагу, а другі, малады, паспешна апрануўся ў камізэльку над свайго роду мадэявым расцяганым ложкам, якое ад уходу рабіла ўражанне свежа сканаўшага на сцюдзёнай тундры вярблюда.

Незнаёмы над скваркамі быў А.Лявіцкі, незнаёмы пры ложку назваў сябе Янка Купала. Я сказаў, што прыехаў сюды на сталую працу. Лявіцкі асцярожна адставіў на падлогу скаводку і здзіўлена выпрастаўся, Купала, які да гэтага часу скончыў свой туалет, схапіў капялюш і палку і, прабурчэўшы нешта кшталтам: "Сам чорт тутака не ўбудзе, калі так далей будзе", — выскачыў за дзверы. Пры гэткіх акалічнасцях завязалася маё першае знаёмства з Янкам Купалам.

У тыя часы Янка Купала меў сталую працу ў бібліятэцы-пажычальні Даніловіча, а ў "Нашай ніве" меў дапаможную працу, за бібліятэкарства атрымліваў 25 руб., а за перагляд і падгатоўку вершаў у "Нашу ніву" меў спамянутае вышэй месца ў канторы для свайго раскладнога ложка і, дадаткова, 5 руб. пенсіі. Паспешны выхад яго з рэдакцыі ў першы дзень нашага знаёмства і тлумачыўся яго жаданнем прыйсці на службу ў бібліятэку без спазнення.

Я прыехаў у Вільню не адзін, а з жонкай. Па некалькіднеўным шуканні кватэру знайшлі мы за 6 рублёў у месяц. Кватэра гэта была на Аляксандраўскім бульвары ў доме №18... Так удачна, на першы пачатак, абаснаваўшыся ў Вільні, рашылі мы з жонкай справіць наваселле. У дадатку, акурат к гэтаму часу, прыехала ў Вільню сястра маёй жонкі, вядомая літоўская пісьменніца Лаздзіну Пяледа (Lazdynu Peleda). Дзеля таго ж, што ў рэдакцыі "Наша ніва" паміж яе тагачаснымі супрацоўнікамі існаваў распадзел, то з рэдакцыйнага персаналу можна было разлічаць на прыняцце запросін на ўбогае наваселле толькі ад асоб, якія засялялі вуглы ў канторы. Словам, за навасельным сталом, аздобленым кіпучым, як вулкан, самаварам з адпаведнымі да яго, стасоўна стану, прыдаткамі мяснога і мучнога характару аказаліся Лявіцкі і Янка Купала.

За вечар гэты сапраўднай першай знаёмасці перагаворана было многа, бо і чарка гарэлкі падагравала і без таго гарачыя галовы.

Янка Купала, тады працуючы ў бібліятэцы, многа чытаў, асабліва навейшых тагачасных расійскіх і польскіх паэтаў. За сталом жа сядзелі ўсё пісьменнікі: Пяледа, якая вызначалася даволі вялікай пладавітасцю, яе сястра, а мая жонка, Марыя з Іваноўскіх, каторай адна аповесць, напісаная па-польску, была адзначана на конкурсе "Biesiady Literackiej", Ядзвігін Ш. (Антон Лявіцкі), Янка Купала і я, найменшы між сільнымі пяром, бо акром некалькіх, даволі няскладных, пісьменніцкіх сваіх спроб і хаатычных імкненняў не меў яшчэ тады за сабой нічога.

Разважалі за сталом аб паэтах і пісьменніках, аб іх тыпах і творах. Мая некаторая начытанасць як быўшага бібліятэкара прыватнай студэнцкай бібліятэкі ў Пецярбургу і прыродная эрудыцыя давалі магчымасць не толькі жыва весці дыскусію, але ў некаторых выпадках кіраваць ёю. Зрэшты, я ў той час захватваўся навуковай літаратурай і не прызнаваў ніякіх раманаў і повесцей, за выключэннем вершаваных, і то апошнія толькі таму, што тады пагалоўна ўсе беларускія пісьменнікі пісалі толькі вершы. Не прызнаваць вершаў нельга было, бо, лагічна разважаючы, трэба было б выступаць і супраць беларускай пісьменнасці, а гэтага апошняга я дапусціць не мог.

Янка Купала хваліў Блока. Асаблівай паклонніцай Славацкага была мая жонка, хоць, у істоце, яе ў тыя часы далёка больш захватваў Метэрлінк з яго немаль надпрыроднай чоўнасцю і пераносні. З гэтай прычыны значную часць вечара заняло зраўніванне творчасці Метэрлінка з творчасцю Славацкага, выражанай асабліва ў паэме "Krol Duch". Лявіцкі быў супраць усякіх "мадэрністаў", з ім салідарызавалася Пяледа. Купала меў з сабой нейкі зборнік расійскіх паэтаў і прачытаў з іх пару вершаў. Тады я дастаў польскага паэта Стафа "Mister Twardowski" (у пазнейшыя часы Я.Купала быў падпаўшы пад некаторы ўплыў Стафа, аб чым можна пераканацца з вершаў, напісаных у 1914 годзе) і вершы Аляксея Талстога і заняў гасцей чытаннем адрыўкаў з названых паэтаў.

Пасля гэтага вечара Я.Купала бываў частым у нас госцем, асабліва ў дні адпачынку, якія, час ад часу, праводзілі разам то дома, то па-за домам — у гарадскіх садах.

Гэтак набліжалася вясна, а за ёй і лета. У творчасці Янкі Купалы пачаў намячацца паварот. Верш "Забытая скрыпка" быў беспасярэдным выразам гэтага павароту, услед за якім паявіўся другі, такога ж характару, верш "На высокай гарэ".

У ліпені месяцы ў рэдакцыю "Наша ніва" прыбыў С.Палуян. Да энтузіястычнай і без таго атмасферы, якая ў тыя часы панавала ў "Нашай ніве", упаў кіпучы мэтэор. Тэмпература атмасферы, а разам з гэтым і тэмпераменты паасобных працаўнікоў адразу падняліся. Пачулася нейкая напружанасць. Горстка беларусоў, прапаведнікаў адраджэння, сабраная каля "Нашай нівы", акружаная з усіх старон варожнай атмасферай, раптам уявіла сабе, што знаходзіцца на полі бітвы. Што напіраючая з усіх старон лавіна варожасці можа змыць іх, што, каб устаяць, патрэбны нейкі надлюдскі высілак, нейкі чын, нейкае дзеянне так яркае, каб, як мігавіца, асляпіла супраціўны абоз і ўстрымала яго. Такі дзіў, усім было ясна, мог адбыцца толькі ў дзедзіне духовасці, толькі ў той горстачцы, якая трымала штандар або гарнулася пад яго. Дзеля гэтага ўчытваліся ў кожную фразу, створаную паміж намі і надасланую нам поштай. Услухаліся чоўка і пільна ў тэмп кожнай карэспандэнцыі, кожнага верша, напісанага пабеларуску. Стаўлялі самі сабе магчыма большыя вымогі. У выніку двох-трохмесячнага такога напружання мы самі ўзраслі, а перш за ўсё ўзрос Янка Купала. Мы гэта чулі і разумелі. Гэты цыкл завяршыў верш Я.Купалы "Снег", які, саўсім беспадстаўна, аўтар падпісаў "паводле Пшыбышэўскага".

Я добра памятаю той вечар, калі быў напісаны гэты верш. Было гэта позняй восенню. Выпаў першы глыбокі белы снег, мяккі, пушысты і цёплы. Мы, як і Палуян, сядзелі ў мяне дома. Было ўжо па 12-й гадзіне вечара. С.Палуян і Я.Купала, як мы тады казалі, "выбіраліся ўжо ў вырай" — меліся выязджаць з Вільні. Выязджаць, шукаючы залатога руна асветы, каб вярнуцца з часам волатамі ў дзедзіне творчасці. С.Палуян і я непакоіліся, што Я.Купала меў некаторую склоннасць да "шклянога бога". У гэты момант увайшоў Я.Купала, румяны, паводле ўсіх азнак, пад знакам Вакха. Пачалося таварыскае казанне. Я.Купала сеў у куце за сталом і маўчаў. На ніякія нашы закіды не адказваў, толькі нешта крэмзаў на пакомканай паперцы алоўкам. Калі мы вычарпалі ўсе свае аргументы і прымоўклі, Я.Купала сказаў: "А цяпер паслухайце, хлопцы". І прачытаў свой верш "Снег".

Цяпер, паражаныя хараством верша, мы змоўклі — усе нашы аргументы былі разбіты. Аказалася, што Я.Купала быў таго вечара ў тэатры, у якім іграліі Пшыбышэўскага "Снег". Мастацтва і прырода ўтварылі настрой, рэшта дапоўніў творчы геній аўтара.

У некалькі дзён пасля гэтага выехаў Я.Купала ў Пецярбург, а С.Палуян у Кіеў. Было гэта ў канцы 1909 года.

Я.Купала правёў у Пецярбургу 1910, 1911, 1912 гады. У 1913 годзе быў ізноў у Вільні ў "Нашай ніве", дзе працаваў над выданнямі "Беларускага выдавецтва", а ў 1914 годзе быў замест мяне фактычным рэдактарам "Нашае нівы".

Да другога перыяду працы Я.Купалы ў Вільні апошні меў ужо за сабой некалькі надрукаваных кніжак: "Жалейка", "Huslar", "Адвечная песня", "Шляхам жыцця" і "Паўлінка".

Некаторыя сур'ёзныя і непрыемныя перажыванні перад выездам з Вільні ў Пецярбург, у 1909 годзе, і жыццёвы рэалізм, пачэрпнуты ў часе бытнасці ў Пецярбургу, а также вечны недастатак паклалі на характар Я.Купалы глыбокі след. Ён, ад прыроды надзелены ўжо замкнутым характарам, яшчэ больш замкнуўся ў сабе. Халоднасць яго таяла, патухшыя вочы загараліся і адкрывалася мройлівая мяккая душа славяніна. Прачыхаўся ў ім грамадзянін, які чутка рэагаваў на палітычныя падзеі і класавую несправядлівасць. Словы яго станавіліся пякучымі і іскрыстымі.

Я не буду спыняцца над творчасцю Я.Купалы з гэтага перыяду — яна ўсім вядома. Я.Купала ўзрос на волата ў беларускай пісьменнасці разам з М.Багдановічам і Я.Коласам.

У 1914 годзе Я.Купала пагаварыў аб тым, што час ужо беларускай пісьменнасці перайсці ад дробных вершаў да паэматаў. Пачынаў збіраць матэрыялы да большага свайго паэтыцкага твора, але надыход вайны разбіў яго імкненні.

Вось галоўнае, што мне памятаецца аб Я.Купалу з часу яго працы ў "Нашай ніве".

1928

Янка КУПАЛА

Я не для вас...

Я не для вас, паны, о не,
У час вольны песенькі складаю, —
Што спала ў сэрцы там на дне —
Буджу і ў свет на суд пускаю.
Я не для вас, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не,
Падчас збываюся спакою,
Калі ў вачах сляза блісне,
Маркотнай вызвана душою, —
Я не для вас, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не,
Свае дні лепшыя марную, —
У вечнай з мукамі вайне
Жыву і радасці не чую —
Я не для вас, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не,
Падняць скібіну слова рвуся
На запусцелым дзірване
Сваёй старонкі Беларусі,
Я не для вас, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не,
Над доляй плачу свайго люду,
З гразёй змяшалі б вы мяне
Сваёй нікчэмнасцю прыблудаў...
Я не для вас, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не,
Пяю. Вам не паняць мучэння;
Вам ваша сэрца не дрыгне
На голас братняга цярпення,
О, не дрыгне, паны, о не!

Я не для вас, паны, о не!..
Адною ўцехаю жыццё вам,
Знячулі ў сытасці, віне,
Вас не разжаліш праўды словам,
О, не разбудзіш вас, о не!

Я не для вас, паны, о не!..
А я для бедных і загнаных,
Я з імі мучуся ўраўне,
У адных закут з імі кайданах...
Я не для вас, паны, о не!..

Я не для вас, паны, о не!..
Я — для тых цёмных,
нешчаслівых.
Ад іх і водгаласак мне
Прымчыцца па лясах, па нівах.
А не для вас, паны, о не!

1907

СТАЛІЦА

Пачулі

Мінгарвыканкам прыняў рашэнне не будаваць хуткасную аўтадарогу праз Севастопальскі парк. Пра гэта паведаміў старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва гарвыканкама Віктар Нікіцін. "Мы ўлічылі негатыўнае стаўленне да гэтага будаўніцтва жыхароў раёна", — зазначыў ён.

Нагадаем, жыхары мікрараёна "Усход-2" выступілі супраць будаўніцтва хуткаснай шматпалоснай аўтадарогі праз Севастопальскі парк. Згодна з планам уладаў горада, шасціпалосная магістраль павінна была прайсці ад перасячэння вуліц Філімонава і Кедышкі праз Севастопальскі парк па вуліцы Олешава да Даўгінаўскага тракту або па вуліцы Каліноўскага.

Марына НОСАВА.

ЧУЛІ?

Артысты-футбалісты едуць на чэмпіянат свету

Тое, што не ўдаецца нацыянальнай зборнай Беларусі па футболе, ўдалося беларускім артыстам. З 24 чэрвеня па 4 ліпеня каманда зорак беларускай эстрады "Арт-Старс" возьме ўдзел у першым у гісторыі чэмпіянаце свету па футболе сярод артыстаў. Ён пройдзе ў Сочы.

Сапернікамі беларусаў па адборачнай групе будуць зборныя Камеруна, Аргенціны і Японіі.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ПРИГЛАШЕНИЕ

Литва открывает границы с помощью музыки

24—26 августа в литовских Норвилишках состоится Международный музыкальный фестиваль "Будем вместе". Белорусы смогут попасть на мероприятие без визы. На белорусско-литовской границе достаточно будет предъявить билет до Норвилишек.

Цель фестиваля — подчеркнуть культурное единство европейских наций. Более 30 музыкальных коллективов из Литвы, Беларуси, Польши, России и других стран выступят на самой большой сцене Литвы. Три дня и две ночи у подножия Норвилишкского замка будет звучать музыка на любой вкус. Ожидается, что Беларусь на фестивале будет представлять группа "Drum Ecstasy", Литву — рок-звезды Андрус Мамантавас и группы "IR", "Mountainside". Организаторы фестиваля уже получили подтверждение в участии известных европейских коллективов — польской группы "Myslovitz", а также "Poets of the Fall" из Финляндии, "Leaves" из Исландии, "Joana & the Wolf" из Британии и другие.

— Все предусмотрено и для зрителей, — говорит третий секретарь посольства Литвы в Беларуси **Эгле Норвайшэне**. — Недалеко от замка будет разбит кемпинг, где смогут разместиться более 10.000 человек. Рядом — закрытая освещенная автостоянка почти на 2000 мест.

В Беларуси уже определен ряд турфирм, где граждане вашей страны смогут приобрести билет до Норвилишек и открыть визу. Организаторы предусматривают и такой вариант — на белорусско-литовской границе белорусам достаточно будет показать билет до Норвилишек, и они, без визы в паспорте, смогут добраться до места проведения музыкального фестиваля.

К слову, Норвилишский замок находится в нескольких метрах от белорусской границы.

Директор фестиваля **Гедрус Климкявичус** в свою очередь отмечает:

— Все знают, что четыре века назад на этой территории была одна страна, одна культура. Потом нас разделили государственные границы. И если говорить кратко, то на это мы и хотим обратить внимание нашим фестивалем.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Дзіўныя звесткі Мінпрыроды

У Беларусі, магчыма, увядуць залогавы кошт для пластыкавых бутэлек. Паводле звестак Мінпрыроды, летам толькі ў цэнтры Мінска за суткі збіраецца каля 7 мільёнаў пластыкавых бутэлек.

Але ці трэба верыць гэтай інфармацыі? Каб накідаць столькі бутэлек, кожны жыхар горада — ад немаўляці да састарэлага — павінен выкінуць па тры бутэлькі. А яны ж вялікія — некаторыя і па два літры... Ці выпіваем мы столькі — пытанне рытарычнае. Але Мінпрыроды настойвае на тым, каб за пластыкавыя бутэлькі людзі плацілі, як і за шкло, і потым мелі магчымасць іх здаваць. У перспектыве на ўсіх уездах у сталіцу плануецца стварыць пункты па іх прыёме.

Дарэчы, летась у Беларусі ўтварылася каля 37 мільёнаў тон адходаў. З іх каля 3,2 тоны з'яўляюцца камунальнымі адходамі. Спецыялістамі Мінпрыроды падлічана, што на аднаго беларуса прыпадае каля 200 кілаграмаў такіх адходаў.

Паліна КРАЎЦОВА.

В Беларуси перепишут всех домашних кошек

Парламент Беларуси рассматривает законопроект "Об обращении с животными", который предусматривает, в частности, обязательную регистрацию всех домашних кошек.

Затронет ли это нововведение других животных, в частности собак, пока не ясно. Отметим, что закон с таким названием депутаты приняли еще в 2004 году, однако Александр Лукашенко отправил его на доработку. В том законопроекте обязательной регистрации подлежали все домашние животные. Также там содержалось положение, согласно которому в одной квартире разрешалось содержать не более двух "животных-компаньонов" ("к которым человек испытывает привязанность и держит для удовлетворения потребностей в общении, в эстетических, познавательных и воспитательных целях"). В проекте нового закона максимальное число домашних питомцев на одну квартиру увеличено до трех.

Ирина МАЛЬЦЕВА.

ШАХМАТЫ

Решите задачу
Э.Бест

Белые: Kpe5, Лf4, Лh6, Kg8 (4).

Черные: Kpg5, пп. h2, h7 (3).

Мат в 3 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахматной композиции трехходовую задачу-миниатюру. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Сверьте решение

Задача Ф.Хладика (опубликована 2.03.): **1.Kpb2!** Цугцванг. 1...C:g4 2.Фe4!, 1...Cg2 2.Kf2, и мат следующим ходом.

Композиция А.Азова ("Народная воля" за 6.04.): 1.Ch7! 1...Kpe5 2.Kf5, и мат следующим ходом.

Шахматная элита

Международная шахматная федерация (ФИДЕ) опубликовала рейтинг сильнейших шахматистов мира, который будет действовать до 1 июля 2007 года. Рейтинг-лист впервые возглавил экс-чемпион мира ФИДЕ индийский гроссмейстер Вишванатан Ананд — 2786. Конечно, рейтинг лидера далек от рекордных достижений великого чемпиона Гарри Каспарова (2851), но сейчас он лучший. На второй позиции экс-чемпион мира болгарин Веселин Топалов — 2772. И лишь третью строчку рейтинг-листа занимает действующий чемпион мира Владимир Крамник (Россия) — 2772. В число 40 лучших также входят: 4.Александр Морозевич (Россия) — 2762, 5.обладатель Кубка мира Левон Аронян (Армения) — 2759, 6.Шариар Мамедьяров (Азербайджан) — 2757, 7.Теймур Раджабов (Азербайджан) —2747, 8.Петер Леко (Венгрия) — 2738, 9.Петр Свидлер (Россия) — 2736, 10.Майкл Адамс (Англия) — 2734, 11.наш бывший земляк Борис Гельфанд (Израиль) — 2733, 12.Василий Иванчук (Украина) — 2729, 13.сильнейшая в мире шахматистка Юдит Полгар (Венгрия) — 2727, 14.Давид Навара (Чехия) — 2720, 15.экс-чемпион мира ФИДЕ Руслан Пономарев (Украина) — 2717, 16.Александр Грищук (Россия) — 2717, 17.Этьен Бакро (Франция) — 2709, 18.Дмитрий Яковенко (Россия) — 2708, 19.Гата Камский (США) — 2705, 20.Владимир Акопян (Армения) — 2703, 21.Алексей Широв (Испания) — 2699, 22.15-летний норвежский вундеркинд Магнус Карлсен — 2693, 23.Ливиу-Дитер Нисипяну (Румыния) — 2693, 24.Найджел Шорт (Англия) — 2691, 25.Кришнан Сашикиран (Индия) — 2690, 26.Павел Эльянов (Украина) — 2686, 27.Сергей Карякин (Украина) — 2696, 28.Сергей Рублевский (Россия) — 2680, 29.Владимир Малахов (Россия) — 2679, 30.Евгений Алексеев (Россия) — 2679, 31.Леньер Домингес (Куба) — 2678, 32.экс-чемпион мира ФИДЕ Рустам Касымжанов (Узбекистан) — 2677, 33.Франциско Вальехо (Испания) —2676, 34.Вадим Милов (Швейцария) — 2675, 35.Золтан Алмаши (Венгрия) — 2675, 36.Люк ван Вели (Голландия) — 2674, 37.Эрнесто Инаркиев (Россия) — 2669, 38.Сергей Тивяков (Голландия) — 2663, 39.Хикару Накамура (США) — 2663, 40.Иван Соколов (Голландия) — 2663.

В первой сотне сильнейших больше всего представителей России — 22. От Украины — 8 представителей, 6 — от Китая, по 5 от Армении, Израиля, Франции, по 4 — от США, Грузии, по 3 — от Индии, Болгарии, Азербайджана, Венгрии, Голландии, Польши. К сожалению, из элитной сотни выбыли белорусские гроссмейстеры Алексей Федоров (Могилев), рейтинг 2611, и Алексей Александров (Минск), рейтинг 2609. Проходной балл в сотню лучших составил 2622.

В копилку миниатюр

В классическом варианте шахматная партия состоит из трех стадий — дебюта, мительшпиля (середина игры) и эндшпиля (окончание). Однако не всегда удается, как говорится, "дожить до эндшпиля". Ошибки в начале и середине партии могут привести к досрочному поражению. В следующей партии, сыгранной на высоком уровне — в высшей лиге чемпионата Беларуси 2007 года, неудачная игра в дебюте привела черных к поражению уже на 12 (!) ходу. Вот как это было.

С.Михайловский — В.Куценков
Сицилианская защита

1.e4 c5 2.Kf3 e6 3.Фe2. Редко встречающийся ход, к которому черные оказались неподготовленными. 3...d5. Проще и лучше 3...Kc6. 4.ed Ф:d5 5.Kc3 Фf5? Ферзь в центре доски расположен неудачно и подвергается нападению белых фигур. К тому же ослабляется защита ферзевого фланга. 6.d4 a6? Неожиданно приводит к катастрофе. Лучше было играть 6...Kf6. 7.g4! Фланговый удар, который ведет к материальным выгодам для белых. 7...Фf6 (Плохо 7...Ф:g4 8.Лg1 Фh5 9.Лg5 Фh6 10.Л:c5 или 8...Фf5 9.Kh4 Фf6 10.Cg5 Ф:d4 11.Лd1 с выигрышем ферзя) 8.Cg5 Фg6 9.Kd5! Теперь сказывается слабость ферзевого фланга черных. 9...f6 10.Kc7+ Kpd8 11.K:a8 fg 12.Фe5! Дальнейшие потери для черных неизбежны. Поэтому они признали свое поражение.

ШАШКІ

Удар, яшчэ ўдар!

Яшчэ 2 лютага мы надрукавалі ліст у рэдакцыю "Мы — за сяброўства!" жыхароў г. Паставы В.Гаўрыша, І.Працука, Ч.Сенкевіча і У. Пушкіна аб тым, што ў іх раёне старадаўняя народная гульня карыстаецца пашанай, і з пажаданнем, каб рубрыка "Шашкі" часцей з'яўлялася на старонках газеты. Потым менавіта яны перадалі нам наступную пазіцыю з прапановай даць яе ў якасці задання №3 нашага блішконкурсу-53:

Белыя (А.Колін): a1, b2, c1, c3, d2, e1, e3, f2, f4, h2, h4 (11).

Чорныя (А.Маісееў): a3, a5, b6, b8, d6, d8, e7, f6, f8, g5, h6 (11).

Белыя ўдарам "хук злева" адпраўляюць чорных у "накдаўн", а затым — і ў "накаўт"! Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Нагадваем: пераможца конкурсу будзе адзначаны. Тэрмін для адказаў — 10 дзён (усё ж гэта бліц). Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34-а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Сітуацыя ўзята з партыі прэстыжнага турніру "Пастаўская вясна"-4, які праводзіцца па ініцыятыве кіраўніка лясгаса А. У. Сапончыка пры падтрымцы мясцовых прадпрымальнікаў і выканкама. У дзесятку яго прызёраў на гэты раз увайшлі экс-чэмпіён свету Андрэй Валюк (Гродна), чэмпіён Украіны Аляксандр Колін, мінскія майстры Уладзімір Беляеўскі, Віталь Варушыла і Андрэй Барышаў, Вадзім Лапін (Кіеў), кандыдат у майстры спорту Сяргей Бурко (Орша), майстры з Мінска Андрэй Маісееў, Дар'я Федаровіч і кандыдат у майстры пастаўчанін Іван Троцкі. У заліку сярод жанчын узнагароджаны сталічныя гімназісткі Дар'я і Вольга Федаровіч, Настасся Стасючонак (Віцебск).

Заслугоўваюць увагі яшчэ тры прыклады:

1.Белыя (А.Колін): b2, c1, d2, e1, e3, e5, f4, h4 (8).

Чорныя (В.Марцінкевіч): a3, a5, b8, c7, e7, g7, h6, h8 (8).

1 ... ab4? 2. ed4 cb6 3. bc3 ba5 4. dc5 5. e:c7 6. cb2 7. h:d8x. "Гол" прамым ударам!.

2.Белыя (В.Варушыла): a3, c1, c3, e1, f4, g1, g3, h2 (8).

Чорныя (В.Януковіч): a5, b8, d6, d8, e5, e7, g7, h6 (8).

Калі тут згуляць 1 ... gf6?, дык 2. ab4 fg5 3. bc5! g:e3 4. ed2 5. d:f8x. "Гол" закручаным ударам!

3.Белыя (А.Барышаў): a3, a5, c3, e1, g3 (5).

Чорныя (А.Маісееў): c5, c7, g5, h6, h8 (5).

1 ... cd4 2. c:e5 gf4 3. ed6 c:e5 4. gh4 fe3 5. ab6 ed4 6. bc7 dc3 7. ab4 8. cb8 ab4 9. be5 ba3 10. ef6 hg5 11. fa1 gf4 12. af6. Ці ёсць у чорных выратаванне? Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Супаставім рашэнні

Давайце іх зверым на раней змешчаных заданнях.

"Сюрпрыз ад аўтара". Мініконкурс-55 (Л. Вітошкін): de3 (d2A) e3, a3x. A(f2) g:h6 (g3) he3 (h2) a7! (a3B) g1x. B(g1) ce3x. Па-за конкурсам (Л. Вітошкін): 1. cd6 2. ef2 3. cb8 4. b:d4! 5. a:g7 cd4 6. gh8 de3 7. hc3 ef2 8. cd4x. Знаёмы матыў.

Першымі правільныя адказы даслалі: Аляксей Толах (Баранавічы), Валерый Гаўрыш (в.Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна), Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў), Васіль Дзялендзік (Бабруйск), Анатоль Пярхальскі (Глыбокае), Анатоль Чумакоў (Светлагорск), Аляксандр Сняжкоў і Віктар Шульга (Мінск), Рыгор Сідарчук (Брэст), Іван Працук (Паставы), Аляксандр Янчук (Камянец) і іншыя.

Міні-конкурс-55 выйграў Аляксей Толах. Яму высылаецца прыз аўтара задання — "Шашечный вестник" №4 (Дрогичин, 2004).

Чэмпіянаты краіны

Яны завяршыліся па гульні ў шашкі-64 і 100 сярод жанчын, а таксама па складанні кампазіцый на вялікай дошцы.

У першым з іх перамаглі мінчанкі майстар Вольга Федаровіч, яе сястра-блізня Вольга і кандыдат у майстры спорту Кацярына Шпакава, у другім — таксама прадстаўніцы сталіцы міжнародны гросмайстар Ірына Пашкевіч, кандыдат у майстры Вольга Федаровіч і міжнародны майстар Вольга Садоўская, а ў трэцім — гросмайстар СССР з Гомеля Леанід Вітошкін, мінчанін Васіль Грабенка і Пётр Кажаноўскі з в.Кашэвічы Пінскага раёна (у раздзеле камбінацыйных мініяцюр), майстар Віктар Шульга з Мінска, Л.Вітошкін і Рыгор Краўцоў з Магілёўскай вобласці (праблемы), Л.Вітошкін, П.Кажаноўскі і майстар з Жодзіна Аляксандр Ляхоўскі (эцюды), мінчанін Анатоль Шабалін, А.Ляхоўскі і пінчук Мікалай Крышталь (задачы).

Наша канкурсантка майстар Марыя Лічко (в. Возера Уздзенскага раёна) удзельнічала ў першынстве па шашках-64, заняла чацвёртае месца і засталася ў вышэйшай лізе на будучы год. Разгледзьце эпізод з яе партыі, дзе яна не "клюнула" на некарэктную камбінацыю і атрымала прыгожую перавагу:

Белыя (Наталля Гацелюк): a3, a7, c1, c3, d2, e1, g1, g3 (8).

Чорныя (М.Лічко): a5, b8, c7, d8, e7, f8, g5, h6 (8).

1 ... cd6 (1 ... cb6? 2. a:c5 gf4 3. g:e5 ed6 4. c:e7 d:b2. Да дамак застаўся адзін крок, але 5. ab4! 5. c:a3x) 2. cb4 3. d:b4 de5 4. gh4 ed4 5. h:f6 6. cb2 gf4 7. bc3 8. a:c1 fe7 9. cd2 hg5 10. dc3 gh4 11. cd4 ef6 12. bc5 dc7 13. ed2! hg3 14. dc3 gh2 15. cb4 fg3 16. ba5 cb6 17. a:c7 18. de5 19. ab8 de3 20. bd6 bc3 21. de7? (трэба было 21. dc7!=) gf2 22. ef6 cd2 23. fh4 fe1x.

В.Шульга таксама пастаянна бярэ ўдзел у нашых конкурсах. Пазнаёмцеся з яго лепшай праблемай, якая ацэнена ў 8,25 ачка:

Белыя: 18, 19, 20, 21, 24, 27, 29, 37, 38, 42, 46 (11).

Чорныя: 2, 3, 9, 10, 11, 15, 28, 30, 35, 36, 39, 40 (12).

1. 46-41 2. 38-33 3. 33:44 4. 21-16 5. 16:7 6. 37-32! 49:12 7. 19:8 8. 29:23!! 30:19A 9. 23:5 10. 5:3x. A8... 28:19 9. 24:4 10. 4:25x. Нічога не скажаш — выдатна!

Мікалай ГЛАДКІ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

...Каб не застацца без «Народнай волі»

Шаноўныя чытачы!

Пагадзіцеся: "Народная воля" павінна выжыць пры любых абставінах! І яе лёс у першую чаргу залежыць ад Вас. Таму не спазніцеся зрабіць **перадаплату** за **другое паўгоддзе**. Да першага ліпеня застаецца ўсяго 9 дзён.

Не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх шасці месяцаў — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно ў чарговы раз паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский наиск обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Віншую

З 50-годдзем Пагарэльцаўскую сярэднюю школу Нясвіжскага раёна і ўвесь выпуск 1957 года.

І.Б.Сандзюк.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 20.06.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №